# НА ШЛЯХУ ДА АГУЛЬНЫХ МІЖНАРОДНЫХ СТАНДАРТАЎ ПРАКТЫКІ РАЗВІЦЦЯ СУПОЛЬНАСЦЕЙ

КАРОТКАЕ КІРАЎНІЦТВА




International Association for Community Development
Association Internationale de Développement et D'Action Communautaires

WITHOUT COMMUNITY DEVELOPMENT
THERE IS NO SUSTAINABLE DEVELOPMENT

**Услед за прыняццем у 2016 г. міжнароднага азначэння развіцця супольнасцей, IACD пачала работу над распрацоўкай рэкамендацый па практыцы развіцця супольнасцей. IACD працавала сумесна з шатландскім Саветам па Стандартызацыі Вывучэння і Развіцця Супольнасцей, і, пасля маштабнага кансультавання з калегамі і практыкамі з усяго свету, прадставіла Агульныя Міжнародныя Стандарты Практыкі Развіцця Супольнасцей на міжнароднай канферэнцыі IACD у Мейнуце ў чэрвені 2018 г.**

IACD, як міжнародная прафесійная асацыяцыя, упэўнена ў тым, што ўсіх спецыялістаў-практыкаў (якія працуюць на платнай ці бясплатнай аснове) важна заахвочваць у прыняцці агульнага разумення мэты развіцця супольнасцей, пабудаванай на агульных каштоўнасцях. IACD мае намер падтрымліваць высокія стандарты практыкі, грунтуючыся на ўзгоджаным калектыўным уяўленні аб тым, што гэта такое і дзе "прафесійны" азначае "кампетэнтны".

## Практыка ў галіне развіцця супольнасцей

Практыка ў галіне развіцця супольнасцей ажыццяўляецца людзьмі, якія выступаюць у розных ролях і кантэкстах, уключаючы людзей, якія прама называюцца прафесійнымі работнікамі супольнасцей (і людзей, якія выконваюць тыя ж абавязкі, але называюцца па-іншаму), сумесна з прафесіяналамі ў іншых галінах: ад сацыяльнай работы, адукацыі для дарослых, працы з моладдзю, медычных дысцыплін, экалагічнай адукацыі, мясцовага эканамічнага развіцця да гарадскога планавання, адраджэння, архітэктуры і г.д., якія імкнуцца прымяняць каштоўнасці развіцця супольнасцей і ўкараняць метады развіцця супольнасцей.

Мы прапануем называць усіх іх "спецыялісты-практыкі па развіцці супольнасцей" і выкарыстоўваць гэта як ўсёабдымны тэрмін.

## Азначэнне развіцця супольнасцяў, прынятае IACD

«Развіццё супольнасцей — гэта і прафесія, якая засноўваецца на практычным вопыце, і акадэмічная дысцыпліна, якая садзейнічае рэалізацыі дэмакратыі, прынятых норм, ўстойлівага развіцця, эканамічных магчымасцей, роўнасці і сацыяльнай справядлівасці праз арганізацыю, адукацыю і пашырэнне правоў і магчымасцей людзей у межах іх супольнасцей, незалежна ад таго ці аб'яднаны яны па прынцыпу месца жыхарства, ідэнтычнасці або інтарэсах, у гарадской або сельскай мясцовасці".

Гэтае азначэнне можна разглядаць як увасабленне асноўных каштоўнасцей, мэтаў і комплексу метадаў працы.

## A. Асноўныя каштоўнасці

Азначэнне сцвярджае каштоўнасці, на якіх павінна грунтавацца практыка:

- прыхільнасць да правоў, салідарнасці, дэмакратыі, роўнасці, экалагічнаяй і сацыяльнай справядлівасці.

Гэта заява пра каштоўнасці пазіцыянуе практыку як працу згодна з этычнымі стандартамі, якія прымяняюцца ў розных кантэкстах, працу з людзьмі і арганізацыямі па рэалізацыі розных мэты.

## B. Мэта

У азначэнні есць сцверджанне аб мэце развіцця супольнасцей: працаваць сумесна з супольнасцямі дзеля захавання прынцыпаў дэмакратыі, устойлівага развіцця, захавання правоў, прадстаўлення эканамічных магчымасцей, дасягнення роўнасці і сацыяльнай справядлівасці.

Такі высокі ўзровень мэтанакіраванасці можа быць выкарыстаны ў якасці эталона для ацэнкі як самога працэсу, так крокаў, зробленых у дасягненні вынікаў.

## C. Асноўныя метады і працэсы

У азначэнні ёсць ясна акрэсленыя сцверджанні об метадах і працэсах, якія выкарыстоўваюцца спецыялістамі-практыкамі па развіцці супольнасцей: "арганізацыя, адукацыя і пашырэнне правоў і магчымасцей людзей у межах іх супольнасцей..."

## D. Удзельнікі

Азначэнне, дадзенае IACD, адносіцца да людзей у іх супольнасцях, незалежна ад таго, ці аб'яднаны яны па прынцыпу месцазнаходжання, ідэнтычнасці або інтарэсах. Можна зрабіць выснову, што перш за ўсё спецыяліст-практык працуе з групамі людзей у межах супольнасці, і ў гэтым, відавочна, сутнасць развіцця супольнасцей. Але супольнасць не існуе ў ізаляцыі, яна ўвесь час узаемадзейнічае з шэрагам урадавых устаноў, неўрадавых арганізацый, камерцыйнымі кампаніямі, пастаўцамі паслуг, кіраўнікамі, палітыкамі і з грамадствам.

## Тэмы і ключавыя накірункі

Мы вызначылі восем тэм, агульных для практыкі развіцця супольнасцей. Яны знаходзяцца ніжэй разам з васьмю ключавымі абласцямі. Кожная ключавая тэма змяшчае шэраг заяваў датычна практыкі, якая прадстаўляе сабой кіраўніцтва для практыкаў у сферы развіцця супольнасцей. Вы можаце даведацца больш у поўнай версіі Стандартаў.

| Назва тэмы | Апісанне тэмы | Ключавыя накірункі |
|---|---|---|
| **Тэма 1:** **Укараненне каштоўнасцей у практыку** | Гэтая тэма сфакусавана на разуменні тых каштоўнасцей, якія ляжаць у аснове практыкі развіцця супольнасцей, незалежна ад тых працэсаў, на якіх яна заснавана, і вынікаў, да якіх яна прыводзіць, а таксама аб прымяненні гэтага разумення ў кантэксце работы асобнага спецыяліста | Разуменне каштоўнасцей, працэсаў і вынікаў развіцця супольнасцей, а таксама прымяненне іх на практыцы ў іншых ключавых накірунках |
| **Тэма 2:** **Узаемадзеянне з супольнасцямі** | Гэтая тэма сфакусавана на знаёмстве з супольнасцямі, з якімі спецыяліст-практык працуе, на разуменні праблем, якія ўплываюць на іх, і на развіцце стасункаў, якія забяспечваюць базу для працы на пазітыўныя змены | Разуменне і зносіны з супольнасцямі, стварэнне і падтрыманне адносін, як з асобнымі людзьмі, так і з групамі людзей. |
| **Тэма 3:** **Агульнае планаванне** | Дадзеная тэма асвятляе развіццё дэмакратычных працэсаў у супольнасцях, пашырэнне магчымасцей ўзаемавыгаднага партнёрства, падтрымку супольнасцей і ўстаноў у мэтах развіцця гэтага кірунку. | Асэнсаванне, развіцце і падтрымка ўдзелу супольнасцей у сумеснай рабоце |
| **Тэма 4:** **Арганізацыя дзеля зменаў** | Дадзеная тэма сфакусавана на стварэнні ўмоў для сумеснай дзейнасці супольнасцей, развіцці неабходных для гэтай дзейнасці ўменняў,  а таксама стварэння ўмоў, пры якіх калектыўная дзейнасць становіцца пераўтваральнай сілай | Даваць супольнасцям магчымасць дзейнічаць разам, павялічваць іх уплыў і, калі неабходна, даваць ім доступ да рэсурсаў і сэрвісаў, развіваць іх уменне кіраваць імі і кантраляваць іх |
| **Тэма 5:** **Навучанне дзеля змен** | Гэтая тэма сфакусавана на паляпшэнні ўмоў навучання людзей у супольнасцях і практыкаў, якія з імі працуюць, дзеля змен і развіцця | Падтрымка сумеснага навучання людзей і арганізацый для  дасягнення сацыяльнага абнаўлення |
| **Тэма 6:** **Разнастайнасць і інклюзія** | Гэтая тэма сфакусавана на прызнанні разнастайнасці і падтрымцы інклюзіі як асноўных аспектаў практыкі | Распрацоўка і ўкараненне практыкі, палітыкі, структур і праграм, якія прызнаюць і паважаюць разнастайнасць, а таксама садзейнічаюць інклюзіі |
| **Тэма 7:** **Лідарства і інфраструктура** | Гэтая тэма сфакусавана на пашырэнні правоў і магчымасцей лідэрства ў супольнасцях і стварэнні інфраструктуры для развіцця супольнасцяў і ўстойлівага сацыяльнага абнаўлення | Садзейнічанне і ўкараненне арганізацыйнага развіцця і інфраструктуры  супольнасці, заахвочванне лідарства, якое забяспечвае пашырэнне правоў і магчымасцей людзей |
| **Тэма 8:** **Распрацоўка і ўдасканаленне палітыкі і практыкі** | Гэтая тэма сфакусавана на выкарыстанні інфармацыі, атрыманай на аснове сумеснай сістэмы адзнакі і аналізу адпаведных знешніх фактараў для ўдакладнення, распрацоўкі стратэгіі і практыкі | Распрацоўка, аналіз і інфармаванне практыкі і палітыкі ў сферы развіцця супольнасцей на аснове зваротнай сувязі для ўдасканальвання стратэгічнай і аператыўнай практыкі |

# Як можна выкарыстоўваць Міжнародныя Стандарты?

Стандарты могуць быць выкарыстаны ў якасці дапаможніка для калектыўнай пастаноўкі мэтаў і вызначэння практычных крокаў, неабходных для іх дасягнення. Яны гэтак жа могуць быць карысныя і для крытычнага аналізу як саміх мэтаў, так і шляхоў іх дасягнення. Іншымі словамі, Стандарты могуць быць выкарыстаны для планавання, рэалізацыі і аналізу дзейнасці, а гэтак жа для таго, каб вучыцца на ўласным вопыце.

Такім чынам, Стандарты могуць быць выкарыстаны ўсімі спецыялістамі ў сферы развіцця супольнасцяў для:

- развіцця агульнага ўяўлення і разумення таго, што такое развіцце супольнасцей;
- прапаганды каштоўнасцей, на якіх заснавана развіццё супольнасцей;
- пашырэння і павышэння якасці практыкі;
- для ўдакладнення канцэпцыі  і палітыкі;
- для развіцця акадэмічнага і практыка-арыентаванага навучання.

Мы спадзяемся, што Стандарты будуць прыняты і выкарыстаны спецыялістамі-практыкамі у краінах, дзе нацыянальныя стандарты ўжо існуюць і вышэйназваныя стануць узаемнадапаўняльнымі, а для краін, дзе нацыянальныя стандарты яшчэ не распрацавалі, яны паслужаць кіраўніцтвам да дзеяння.

У працэсе распрацоўкі Стандартаў мы папрасілі ўдзельнікаў кансультацый прапанаваць шляхі выкарыстання Стандартаў. Іх адказы мы прадстаўляем ніжэй:

- для дыскусіі аб назначэнні, каштоўнасцях і ключавых накірунках развіцця супольнасцей у міжнародным і мясцовым кантэкстах, у межах адной ці паміж некалькімі супольнасцямі і паміж агенцтвамі і арганізацыямі;
- для развіцця рэсурсаў, якія дапамогуць паказаць, наколькі розныя кантэксты маюць уплыў на агульныя галіны практыкі ў межах некалькіх краін/супольнасцей;
- для падтрымкі міжнародных сетак, абмену  вопытам і практычнымі прыкладамі;
- для садзейнічання агульнаму разуменню ключавых установак і каштоўнасцей развіцця супольнасцей паміж саміх супольнасцей і арганізацый;
- для  абмеркавання сумеснага  планавання і кіравання супольнасцямі, што дае магчымасць калектыўным дзеянням, пашырае правы і магчымасці;
- для інфармавання аб праектах неперарыўнай адукацыі і навучання ў працэсе дзейнасці спецыялістаў-практыкаў па развіцці супольнасцей;
- для распрацоўкі інструментаў самаацэнкі рэфлексіўнай практыкі;
- для падтрымкі абмену вопытам і прыкладамі таго, як Стандарты выкарыстоўваюцца для развіцця практыкі ў кожным з ключавых накірункаў,  уключаючы міжнародны досвед па агульных тэмах;
- для развіцця міжнародных рэсурсаў , для ўключэння ў адукацыйныя  праграмы і праграмы павышэння кваліфікацыі, вылучэння спрэчных асаблівасцей практыкі;
- для ўдакладнення дадзеных у архіве рэсурсаў навучання Міжнароднага Абмену па Развіцці Супольнасцей (GCDEX) IACD;
- для стварэння "агульнай базы", на аснове якой развіваліся б міжнародныя даследаванні, якія вывучаюць аспекты практыкі развіцця супольнасцей.

## Для атрымання дадатковай інфармацыі аб IACD і поўнай версіі Агульных Міжнародных Стандартаў звяжыцеся з намі:

t:+44 141 248 1924 e: info@iacdglobal.org | www.iacdglobal.org

facebook.com/IACDglobal/ @IACD_global @IACDglobal

International Association for Community Development

## Каб даведацца, як стаць членам IACD, перайдзіце на наш вэб сайт:

www.iacdglobal.org/join-us/

Standards Council Scotland

International Association for Community Development
Association Internationale de Développement et D'Action Communautaires
WITHOUT COMMUNITY DEVELOPMENT THERE IS NO SUSTAINABLE DEVELOPMENT

The Scottish Government
Riaghaltas na h-Alba

© IACD 2020

International Association for Community Development, Baltic Chambers, Suite 305, 50 Wellington Street, Glasgow G2 6HJ, Scotland, UK